Мінск, 26 сакавіка 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Дазвольце павіншаваць Вас з 25-годдзем усталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Балгарыя.

За гэты перыяд мы разам прайшлі шлях пабудовы ўстойлівага фундаменту сяброўскіх адносін, якія грунтуюцца на прынцыпах узаемнай павагі.

У Беларусі і Балгарыі паспяхова працуюць дыпламатычныя прадстаўніцтвы абедзвюх краін, спрыяючы развіццю двухбаковых кантактаў. Створана салідная дагаворна-прававая база. Нашы краіны ўзаемадзейнічаюць у рамках міжнародных арганізацый, у тым ліку па глабальных праблемах сучаснасці.

У апошнія гады ў двухбаковых адносінах назіраецца пазітыўная дынаміка палітычных кантактаў, гандлёва-эканамічных і навукова-тэхнічных стасункаў, рэгіянальных і гуманітарных сувязяў.

Выказваю надзею на тое, што агульнымі намаганнямі мы зможам максімальна эфектыўна выкарыстаць існуючы патэнцыял двухбаковага супрацоўніцтва, на карысць народам Беларусі і Балгарыі.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, шчырыя віншаванні, пажаданні моцнага здароўя і поспехаў на дзяржаўнай пасадзе, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей